«ЗАЦВЯРДЖАЮ»
Рэктар
установы адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
_______________ Ю.П. Голубеў
“_03_” ___10_______ 2025 г.

# ВОДЗЫЎ АПАНІРУЮЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

**установы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна” на дысертацыю Ананькі Кірыла Дзмітрыевіча “Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)”, прадстаўленай на саіскальніцтва навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя**

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

Змест дысертацыі Ананькі К.Дз. “Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)”, прадстаўленай на саіскальніцтва навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, адпавядае заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі – гістарычныя навукі.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў распрацоўку навуковай праблемы з ацэнкай яго значнасці.**

На падставе комплекснага аналізу разнастайных крыніц (нарматыўна-прававой дакументацыі, архіўных матэрыялаў і крыніц асабістага паходжання з фондаў дзяржаўных архіваў, бібліятэк і музеяў Беларусі і Літвы, перыядычнага друку) з выкарыстаннем агульнанавуковых і спецыяльных гістарычных метадаў падрыхтавана дысертацыйнае даследаванне па актуальнай тэме гістарычнай навукі. Саіскальнікам уведзена ў навуковы ўжытак пэўная частка крыніц, выяўленых ім у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці, Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці, Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Мінскім абласным краязнаўчым музеі, Занальным дзяржаўным архіве ў г. Маладзечна, гісторыка-краязнаўчых музеях гарадоў Дзятлава і Навагрудка, а таксама ў Літоўскім цэнтральным дзяржаўным архіве.

У ходзе даследавання дысертант атрымаў наступныя вынікі:

– выявіў эвалюцыю станаўлення і развіцця беларускіх гімназій (сярэдніх школ з беларускай мовай навучання) на тэрыторыі Заходняй Беларусі ад польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. да восеньскіх падзей 1939 г., калі адбылося ўз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР;

– ахарактарызаваў педагагічны склад і вучнёўскі кантынгент беларускіх гімназій Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.), выявіў іх колькасныя і якасныя паказчыкі;

– адлюстраваў уплыў грамадска-палітычнага жыцця заходнебеларускіх зямель, якія знаходзіліся ў складзе Польшчы ад Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. да вераснёўскага (1939 г.) паходу Чырвонай арміі, на функцыянаванне існуючых там беларускіх гімназій;
– раскрыў сацыякультурную дзейнасць беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) у неспрыяльных умовах сацыяльна-эканамічнага прыгнечання, нацыянальна-культурнага і канфесійнага ўціску.

Распрацаваная дысертантам тэма з'яўляецца актуальнай для рэалізацыі гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Яна адпавядае Прыярытэтным напрамкам даследаванняў па гуманітарных навуках, зацверджаных 19 ліпеня 2023 г. паводле рашэння Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Пэўныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана навуковая ступень.**

Вынікі дысертацыйнага даследавання Ананькі К.Дз. маюць дастаткова высокую ступень навізны. Наватарскімі з'яўляюцца навуковыя палажэнні, якія вынесены на абарону.

Выкарыстоўваючы традыцыйныя і наватарскія навуковыя метады, дысертант на падставе шырокага кола крыніц ажыццявіў комплекснае даследаванне станаўлення і развіцця беларускіх гімназій (заканадаўчыя, структурна-арганізацыйныя, кадравыя, вучэбна-метадычныя, выхаваўчыя кампаненты ў іх функцыянаванні; уключэнне ўстаноў сярэдняй адукацыі ў грамадска-палітычныя і нацыянальна-культурныя працэсы) на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

Навізна атрыманых вынікаў заключаецца ў наступным:

– распрацавана аўтарская перыядызацыя дзейнасці беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі (1919–1921 гг.; 1921–1928 гг.; 1928–1931 гг.; 1932–1939 гг.), дадзена сутнасная характарыстыка вылучаных перыядаў (фарміраванне перадумоў, арганізацыя і ўтварэнне беларускіх сярэдніх навучальных устаноў; уключэнне іх як прыватных школ у сістэму адукацыі Польскай дзяржавы; актыўны ўдзел настаўнікаў, вучняў у грамадска-палітычных працэсах, культурным жыцці Заходняй Беларусі);

– выкарыстоўваючы прасапаграфічны аналіз і іншыя навуковыя метады, на аснове біяграфічных і статыстычных звестак выяўлены нацыянальныя, канфесіянальныя, сацыяльныя, гендарныя паказчыкі настаўнікаў і вучняў беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі, на падставе якіх створаны калектыўны партрэт вучнёўскага складу і педагагічнага персаналу, а таксама ўстаноўлена колькасць навучэнцаў, што на працягу 1919–1939 гг. прайшла праз беларускія гімназіі (каля 3,2 тыс. чалавек);

– сістэматызаваны веды пра арганізацыю і адметнасці адукацыйнага працэсу ў беларускіх гімназіях (асаблівасці методык і педагагічных тэхналогій; прыярытэтнасць нацыянальна-патрыятычнага выхавання і захавання этнакультурнай, нацыянальнай ідэнтычнасці; развіццё канцэпцыі

гуманістычнай і нацыянальнай школы; лідарства Віленскай беларускай гімназіі як галоўнага вучэбна-метадычнага цэнтра Заходняй Беларусі);

– вызначана спецыфіка беларускіх гімназій як цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў 1921–1939 гг., дзе вучні насуперак існуючым матэрыяльным цяжкасцям, перашкодам з боку польскіх улад мелі магчымасці для павышэння інтэлектуальнага, эстэтычнага ўзроўняў, фізічнага выхавання, маральнага і патрыятычнага выхавання;

– уведзена ў навуковы ўжытак пэўная частка крыніц (архіўных дакументаў, эга-дакументаў (успамінаў), фотаматэрыялаў і інш.), выяўленых саіскальнікам падчас пошукавай працы ў фондах айчынных архіваў, бібліятэк, музеяў, а таксама за мяжой.

**Рэкамендацыі па практычным прымяненні і выкарыстанні вынікаў дысертацыйнага даследавання.**

Вынікі дысертацыйнага даследавання Ананькі К.Дз. можна выкарыстоўваць у галіне навукі, адукацыі, у сацыякультурнай практыцы ўстаноў культуры. Яны з'яўляюцца каштоўнай асновай для правядзення далейшых навуковых даследаванняў па падрыхтоўцы як вузкатэматычных прац, так і ажыццяўлення комплекснага навуковага даследавання стану грамадства, сацыяльна-палітычных працэсаў, становішча духоўнай сферы, паўсядзённага жыцця насельніцтва заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы ў 1921–1939 гг. ва ўмовах палітыкі паланізацыі. Іх можна выкарыстоўваць для навуковай распрацоўкі праблематыкі па гісторыі, адукацыі, культуры ў заходніх абласцях у перыяд інтэграцыі ў Савецкую дзяржаву пасля іх уз'яднання з БССР (1939–1941 гг.).

Фактычны матэрыял дысертацыі, яе высновы могуць выкарыстоўвацца ў адукацыйным працэсе ўстаноў вышэйшай адукацыі, сярэдніх спецыяльных навучальных установах, сярэдніх школах (пры вывучэнні гісторыі Беларусі, гісторыі беларускай дзяржаўнасці, гісторыі культуры Беларусі, гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі, педагогікі, методыкі выкладання вучэбных прадметаў у сярэдняй школе і інш.). Дысертант укараніў вынікі ўласнага даследавання ў вучэбны працэс установы адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы". Таксама вынікі дысертацыі можна прымяняць у культурна-асветніцкай дзейнасці музеяў, пры распрацоўцы экскурсій і турыстычных маршрутаў. Яны з'яўляюцца карыснымі для СМІ, айчыннага кінематографа.

**Заўвагі па дысертацыі.**

1. Дысертанту варта было пашырыць храналагічныя рамкі свайго даследавання і вызначыць іх перыядам 1919–1939 гг., а не абмяжоўвацца перыядам 1921–1939 гг. Беларускія гімназіі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якія з'яўляліся прадметам даследавання дысертацыі, узнікалі якраз у 1919–1920 гг. Акрамя таго, у зробленай дысертантам перыядызацыі дзейнасці беларускіх гімназій вылучаны першы перыяд (1919–1921 гг.), які выходзіць за межы абвешчаных у дысертацыі яе храналагічных рамак.

2. У прафесійнай характарыстыцы педагагічнага корпусу (раздзел 3.1 дысертацыі) ці ў характарыстыцы адукацыйнага працэсу беларускіх гімназій (раздзел 4.1 дысертацыі) выкладзены недастаткова разгорнуты аналіз вучэбнай, вучэбна-метадычнай літаратуры. Аднак пры гэтым дысертантам былі зроблены высновы: "Галоўным вучэбна-метадычным цэнтрам стала Віленская беларуская гімназія, якая валодала неабходнай рэсурснай базай. Асноўная задача заключалася ў адаптацыі **вялікай колькасці падручнікаў** *(выдзелена намі)* пад нацыянальную адукацыю шляхам перакладу на беларускую мову" (арк. 88 дысертацыі); "Педагогі гімназіі Б. Тарашкевіч, А. Смоліч, А. Неканда-Трэпка, М. Гарэцкі, Л. Гарэцкая, І. Дварчанін, С. Паўловіч і іншыя ўнеслі значны ўклад у развіццё айчыннай вучэбна-метадычнай базы шляхам распрацоўкі **вялікай колькасці асветніцкіх выданняў, кніг і падручнікаў** *(выдзелена намі)*" (арк. 119 дысертацыі). Хоць у табліцы Д. 3 (арк. 164 дысертацыі) прыведзены кніжныя выданні, якія выкарыстоўвалі на ўроках у беларускіх гімназіях у 1920-я гг., аднак у бібліяграфічным спісе дысертацыі няма падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў (выключэнне складаюць усяго толькі 3 вучэбныя выданні: В. Остэрлёфа па сусветнай гісторыі, Р. Віппэра па Новай гісторыі, С. Паўловіча "Пішы самадзейна").

3. У аглядзе гістарыяграфіі праблематыкі даследавання не звернута ўвага на такія працы сучаснай гістарычнай навукі, як "Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч." – частка 2 (Мінск, 1995), "Гісторыя Беларусі: у 6 т." – т. 5 (Мінск, 2006), "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн." (Мінск, 2011–2012), "Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.: в 2 кн." – кніга 1 (Минск, 2014, 2021) і інш. Варта было адзначыць і вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" (Мінск, 2022). Карыснымі з'яўляюцца крыніцы, апублікаваныя ў выданні "Польша-Беларусь (1921–1953): сб. документов и материалов" (Минск, 2012). Хоць аўтар дысертацыі выкарыстоўваў некаторыя працы замежнай беларускай дыяспары, аднак не зрабіў іх гістарыяграфічнага аналізу.

4. У дысертацыі не прасочваецца далейшы лёс выпускнікоў беларускіх гімназій: іх вучоба ў польскіх ВНУ (найперш у Віленскім універсітэце імя Стэфана Баторыя), у БССР, у Чэхаславакіі; працаўладкаванне, прафесійная, грамадская дзейнасць і інш.

5. Не адлюстравана ўзаемадзеянне беларускіх гімназій (найперш Віленскай) з Беларускім навуковым таварыствам, беларускім музеем у Вільні і шэрагам іншых заходнебеларускіх арганізацый і ўстаноў.

6. Дысертантам дапушчана ў тэксце памылка: у "Гарадку Вілейскага павета (цяпер Маладзечанскі раён **Віцебскай вобласці** *(выдзелена намі)*" (арк. 50 дысертацыі). Трэба: "… **Мінскай** вобласці)".

Аднак выказаныя заўвагі маюць рэкамендацыйны характар і істотна не ўплываюць на агульную станоўчую ацэнку дысертацыйнага даследавання.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саікальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Навуковая кваліфікацыя саіскальніка Ананькі Кірыла Дзмітрыевіча пацвярджаецца зместам дысертацыі і аўтарэферата, поўнасцю адпавядае кваліфікацыі кандыдата гістарычных навук. Выкананая ім дысертацыйная праца “Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)” з’яўляецца завершаным кваліфікацыйным самастойным даследаваннем, якое афармлена паводле неабходных патрабаванняў ВАК Рэспублікі Беларусь. Дысертант прадэманстраваў добрае валоданне разнастайнымі навуковымі метадамі, навыкі працы з крыніцамі.

Паводле вынікаў выканання дысертацыйнага даследавання Ананька Кірыл Дзмітрыевіч заслугоўвае прысуджэння навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя **за:**

– распрацоўку аўтарскай перыядызацыі дзейнасці беларускіх гімназій (сярэдніх школ з беларускай мовай навучання) на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы ў 1921–1939 гг. (выдзяленне і сутнасную характарыстыку перыядаў: 1919–1921 гг. – складванне перадумоў, арганізацыя і ўтварэнне беларускіх сярэдніх навучальных устаноў падчас польска-савецкай вайны; 1921–1928 гг. – уключэнне беларускіх гімназій як прыватных школ у сістэму адукацыі Польскай дзяржавы, іх удзел у грамадска-палітычных працэсах заходнебеларускіх зямель; 1928–1932 гг. – функцыянаванне беларускіх гімназій ва ўмовах узмацнення паланізацыі і адміністрацыйна-паліцэйскага ўціску з боку польскіх улад, пашырэння ўплыву левարадыкальнай плыні заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху; 1932–1939 гг. – пераўтварэнне беларускіх гімназій у Вільні і Навагрудку ў дзяржаўныя ўстановы адукацыі, ліквідацыя польскімі ўладамі беларускіх гімназій, змаганне нацыянальнай інтэлігенцыі за захаванне Віленскай беларускай гімназіі);

– характарыстыку нацыянальных, канфесіянальных, сацыяльных, гендарных паказчыкаў педагагічнага персаналу і вучнёўскага кантынгенту беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.), у выніку якой выяўлена сукупнасць адметнасцей настаўніцкіх кадраў і навучэнцаў (сярод педагогаў былі пераважна беларускія грамадска-палітычныя і культурныя дзеячы; большасць вучняў мела сялянскае паходжанне; поліэтнічны і поліканфесійны склад настаўнікаў і вучняў), падлічана агульная колькасць школьнікаў, якія вучыліся ў беларускіх гімназіях;

– раскрыццё спецыфікі арганізацыі адукацыйнага працэсу ў беларускіх гімназіях (распрацоўкі вучэбна-метадычнага забеспячэння, лідарства ў гэтай справе Віленскай беларускай гімназіі; развіцця канцэпцыі гуманістычнай і нацыянальнай школы); удзелу беларускіх гімназій у грамадска-палітычным жыцці заходнебеларускіх зямель; сацыякультурнай дзейнасці беларускіх гімназій у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага прыгнечання, палітыкі паланізацыі, што дазволіла паказаць ролю педагогаў і навучэнцаў беларускіх гімназій у захаванні этнакультурнай ідэнтычнасці насельніцтва краю;

увядзенне ў навуковы ўжытак новых крыніц (архіўных дакументаў, крыніц асабістага паходжання і інш.), якія ў сукупнасці з ужо вядомымі пластамі крыніц далі магчымасць скласці аб'ектыўную навуковую карціну функцыянавання беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

Паводле загада рэктара установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна" № 648 ад 25.09.2025 г., водзыў на кандыдацкую дысертацыю Ананькі Кірыла Дзмітрыевіча "Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)" абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні навуковага сходу (сумеснага пасяджэння кафедры гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін і кафедры ўсеагульнай гісторыі і паліталогіі) установы адукацыі "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна" 03.10.2025 г. (пратакол № 1). У ходзе працы сходу К.Дз. Ананька выступіў з дакладам, адказаў на пытанні яго ўдзельнікаў па зместу і атрыманых выніках дысертацыйнага даследавання, а таксама даў адказы на заўвагі эксперта.

У пасяджэнні навуковага сходу ўдзельнічалі 21 чалавек (сярод іх – 2 дактары гістарычных навук, 12 кандыдатаў навук).

Вынікі галасавання: "за" – 14, "супраць" – няма, "устрымаліся" – няма.

Старшыня пасяджэння
навуковага сходу,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт, дэкан гістарычнага факультэта А.А. Савіч

Эксперт,
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры
гісторыі Беларусі і спецыяльных
гістарычных дысцыплін А.М. Вабішчэвіч

Сакратар пасяджэння,
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры
гісторыі Беларусі і спецыяльных
гістарычных дысцыплін В.У. Сушко

АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Подпіс ........ пацвярджаю
Нач. АК БрДУ ........